# 6 СОВРЕМЕННЫЕ ТЕНДЕНЦИИ РАЗВИТИЯ НАЧАЛЬНОГО ОБРАЗОВАНИЯ

УДК 37.016

## СІСТЭМА ЎЯЎЛЕННЯЎ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ ПРА БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ ПЕСНІ

К. А. Андрыеўская
*УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»;*
*Навук. кір. – А. С. Васілеўская, к.філ.н, дацэнт*

## THE SYSTEM OF CONCEPTS OF LOWER SCHOOL STUDENTS ABOUT BELARUSIAN FOLK SONGS

K. A. Andrievskaya
*Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank;*
*Minsk (Republic of Belarus)*
*Scientific adviser – E. S. Wasilewskaya, Dr. PhD Associate professor*

У артыкуле аналізуюццы вынікі анкетавання малодшых школьнікаў, выяўлецца ўзровень іх ведаў пра беларускія народная песні.

The article analyzes the results of the survey of junior high school students and reveals the level of their knowledge about Belarusian folk songs.

Ключавыя словы: фальклор; песні; літаратурнае чытанне; музыка.

Keywords: folklore; songs; literary reading; music.

Вывучэнне фальклору у пачатковай школе павінна пазнаёміць дзяцей з рознымі жанрамі вуснай народнай творчасці: песні, загадкі, прыказкі, прымаўкі, казкі і г.д. Значнае месца сярод гэтых жанраў займае песня.

Фальклорныя песні – гэта пакінутая нам у спадчыну ад продкаў натуральная сістэма, якая забяспечвае здаровую ўзаемадзейнасць чалавека з навакольным светам, з іншымі людзьмі, з самім сабою. У навуковых даследаваннях неаднойчы выказвалася ідэя жывучасці старажытных народных песень і іх тэрапеўтычнага ўздзеяння на чалавека. Гэта і цялесная тэрапія, пазбаўленне ад саматычных хвароб, якія ў эпоху антычнасці і сярэднявечным Кітаі лячылі музыкай і вакалам, спецыяльнымі вібрацыйнымі практыкаваннямі. Гэта і выкарыстанне розных аспектаў народнага мастацтва з мэтай пазбаўлення ад хвароб душэў ных або для пашырэння межаў самапазнання, самаўсведамлення [1, с. 45].

Народныя песні на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі вывучаюцца на ўроках музыкі і ўроках літаратурнага чытання.

На ўроках літаратурнага чытання дзеці пачынаюць знаёміцца з народнымі песнямі ў 2 класе. Гэта песні "Ох і сеяла Ульяніца лянок", "Лён-ляночак" [2, с. 31-32], калядныммі песнямі "Добры вечар таму, хто у гэтым даму", "Го-го-го каза" [3, с. 100-101], калыханкамі "Ходзіць коцік па палях", "Баю-баінку-баю" [4, с. 22], вясновымі песнямі "Вясна красна, адкуль прыйшла" і "Ты, пчолачка ярая" [4, с. 32]. Гэтыя песні жанрава і тэматычная разнастайныя, што дазволіць пазнаёміць малодшых школьнікаў з асноўнымі відамі беларускіх народных песень.

Акцэнт на вывучэнне народных песень на ўроках музыкі зроблены ў 4 класе. Ужо ў першым паўгоддзі дзеці пачынаюць знаёміцца з раздзелам "Музыкальная культура Беларуси" [5], дзе ў межах тэм "Рождение и жизнь народной песни", "Осенние песни", "Музыкальные сказки белорусского народа", "Музыкальные игры белорусского народа" і "Белорусские музыкальные инструменты" вывучаюца наступныя песні: "Пайшоў Ясь наш на лужок", "Чаму ж мне не пець", "Ох, і сеяла Ульяніца лянок", "Спі, сыночак міленькі", "Ой, мамачка, восень", "Відзіць маё вочка", "Бачыць маё вочка, што край недалёчка", "Музыка-чарадзей", "Як паставіў верабейка на сметнічку хату".

У тэме "Танцевальная культура моего народа" вывучаюць падпеўкі пад беларускія народныя гульні "А мы грушу пасадзілі", "У мядзведзя на бару", "Журавель". А ў тэмах "Музыка рассказывает о прошлом нашей Родины" і "Музыка в народных обрядах и праздниках (Каляды)" вывучаюць каляндарныя песні і песні, якія суправаджаюць танцы: "Го-го-го, каза", "На нова лета", "Янка-полька", "Юрачка", "Мікіта", "Крыжачок".

У другім паўгоддзі ў тэмах "Музыка народов, населяющих Республику Беларусь", "Музыка в народных обрядах и праздниках (Купалле)" дзеці вывучаюць тры беларускія песні: "Купалінка", "Ой, рана на Йвана", "Сёння Купала, а заўтра Ян".

Такім чынам, мы бачым, што на ўроках музыкі народныя песні прадстаўлены больш шырока.

Урокі музыкі і літаратурнага чытання вырашаюць і розныя задачы. Так, на ўроках музыкі дзеці павінны засвоіць асноўныя музычныя жанры: простыя (песня, танец, марш) і больш складаныя (опера, балет, сімфонія, музыка з кінафільмаў); зразумець асаблівасці музычнай мовы; у іх павінны фарміравацца музычна-практычныя уменні і навыкі музычнай дзейнасці (сачыненне, ўспрыманне, выкананне), а таксама – творчыя здольнасці [5].

Задачай урокаў літаратурнага чытання ў пачатковай школе з'яўляецца ў першую чаргу маральнае, эстэтычнае і этнакультурнае выхаванне навучэнцаў. І калі гаварыць пра вывучэнне народных песень, то праграма ставіць перад задачу – даць уяўленне пра жанры вуснай народнай творчасці, навучыць аналізаваць творы розных жанраў [6].

Аднак не заўсёды гэтыя задачы вырашаюцца.

У якасці падцверджання гэтага можна прывесці вынікі анкетавання, праведзенага ў 2021-2022 гадах у чацвёртых класах ДУА «Гімназія № 23 г. Мінска", ДУА "Гімназія № 8 г. Мінска", ДУА "Сярэдняя школа № 153 г. Мінска», ДУА «Пачатковая школа № 29 г. Мінска», ДУА "Гімназія № 28 г. Мінска", "Гімназія №17 г. Мінска", шэрагу ўстаноў адукацыі Дзяржынскага, Вілейскага, Бярэзінскага раёнаў Мінскай вобласці.

Два пытанні анкеты былі накіраванны на выяўленне ведаў малодшых школьнікаў пра народныя песні: *1) Якія народныя беларускія песні вы вывучаеце у школе? 2) Якія беларускія народныя песні вы спяваеце у сям'і?*

Адказы на першае пытанне размеркаваліся наступным чынам:

62,43% назвалі беларускія народныя песні: "Лявоніха", "Мікіта", "Ох і сеяла Ульяніца лянок", "Жаваранкі да нас ляцяць", "Купалінка", "Го-го-го каза", "Саўка ды Грышка", "Музыка-чарадзей", "Добры вечар таму, хто у гэтым даму", "Чубарыкі-чубчыкі", "Бульба", "Гармонік", "Гуканне вясны", "Прывітальная каза", "Перапёлачка", "Зайграй жа мне дудачку". Нярэдка навучэнцы проста пазначалі жанр песні: "Жартоўныя", "Жнівеньскія", "Забаўлянкі", "Калядныя", "Купалаўскія", "Масленічныя","Народныя", "Веснавыя".

15,64% напісалі аўтарскія песні, нават гімн Беларусі і гімн горада Мінска: "Беларусь чароўная", "Восень", "Наша Краіна", "Гара-горачка", "Песня пра Мінск", "Я беларус", "Закліканне вясны". Дастаткова часта ўзгадваліся творы масавай культуры: Лучык сонца залатога", "Ягада-малінка", "Цячэ вада ў ярок", "Мне кажыцца парою", "Там дзе клён шуміць" і інш.

3,06% назвалі творы іншых жанраў – вершаў, казак, забаўлянак: "А мы грушу пасадзілі", "Алавяны салдацік", "Лістапад", "Мама-першае слова", "Мішка", "Наступае зіма", "Осень", "Пра васілёк", "Пра маці", "Тры каты", "Два ката", "Мой Край","Павук","Петушок","Бабулечка","Кошка выйшла за ката", "Дожджык, дожджык – сікані".

0,85% напісалі рускія народныя песні: "Бярозка", "Дуб", "Кукушка", "Кацюша".

Самімі папулярнымі народнымі песнямі сталі: "Ох і сеяла Ульяніца лянок" (яе ўзгадалі 9,35% апытаных), "Жаваранкі да нас ляцяць" (7,31%), "Мікіта"

(5,27%), “Купалінка” (4,93%), “Го-го-го каза” (3,57%), “Саўка ды Грышка” (3,23%). Усе гэтыя песні дзеці вывучалі ушколе на ўроках музыкі і толькі дзве на ўроках літаратурнага чытання “Го-го-го каза” і “Ох і сеяла Ульяніца лянок”

Прааналізаваўшы адказы, мы можам адзначыць, што дзеці не зусім дакладна разумеюць спецыфіку народных песень: нярэдка для іх народная і папулярная, масавая песні – гэта адно і тое ж.

10,71% ад усіх удзельнікаў анкетавання не адказалі на пытанне.

Аналіз адказаў на другое пытанне *Якія беларускія народныя песні вы спяваеце ў сям’і?* даў наступныя вынікі.

51,3% не далі адказу.

26,7% назвалі беларускія народныя песні: “Го-го-го каза”, “Зайграй жа мне дудачку”, “Лявоніха”, “Ох, рэчанька”, “Саўка ды Грышка”, “Ох і сеяла Ульяніца лянок”, “Добры вечар таму, хто у гэтым даму”, “Купалінка”, “Жаваранаўкі прыляціце”, “Гуканне вясны”. Цікава, што нярэдка дзеці запісвалі не назву, а радкі з песні, напрыклад, “Кветкі рвець, вяночкі звівае, слёзкі пралівае” – радкі з песні “Купалінка”.

7,8% апытаных назвалі аўтарскія песні: “Белая Русь”, “Родныя прыпеўкі”, “Чырвона ружа”, “Гімн”, “Касіў Ясь канюшыну”. “Лучык сонца залатога”, “Цячэ вада ў ярок”, “Ягада-малінка”. “Мне кажыцца парою”, “Там дзе клён шуміць”.

А 3% апытаных – творы іншых жанраў: “Алёнка” , “Дожджык, дожджык – сікані”, “Мама і папа”, “Пра гусей”, “Пра Новы год”, “Псяхушка”, “Уляля”. 1,2% - рускія народныя песні: “Жураўлі”, “Во полі бярозка стаяла”.

Найбольш часта дзеці называлі наступныя беларускія народныя песні: “Купалінка” (6%), “Добры вечар таму, хто у гэтым даму” (4,5%), “Жаваранаўкі прыляціце” (4,2%) , “Гуканне вясны” (3,9%).

Гэта дае нам падставы канстатаваць, што зараз у сем’ях спяваюць мала, і народныя песні складаюць вельмі невялікую частку таго, што слухаюць і што падабаецца дзецям.

Калі мы выберам самыя частотныя назвы песень, якія сустракаліся ў анкетах, то ўбачым, што гэта тыя творы, што вывучаюцца ў школе: "Лявоніха" (назвалі 1.36 % апытаных), "Бульба" (1.02%), "Саўка ды Грышка" (3,23%), "Перапёлачка" (2,38%), "Зайграй жа мне, дударачку" (2,72%), "Крыжачок" (0,1%), "Мікіта" (5,27%).

Самым частотным стаў адказ “Купалінка”(8%), мабыць, таму, што гэта песня была заўсёды на слыху.

Калі супаставіць вынікі адказаў на першае і на другое пытанне, то можна заўважыць, што варыянтаў беларускіх народных песень, прапанаваных у

адказах на першае пытанне, нашмат больш, чым у адказах на на другое. Можна меркаваць, што асноўнай крыніцай знаёмства малодшых школьнікаў з беларускім песенным фальклорам застаецца школа, а не сям'я.

Калі параўнаць адказы навучэнцаў гарадскі і раённых школ, то мы ўбачым, што дзеці з раённых школ ведаюць нашмат больш беларускіх народных песень (62,43%), у параўнанні з дзецьмі, якія жывуць у горадзе (26,7%).

Такім чынам, можна зрабіць вывад, што школе належыць вядучае месца ў сферы знаёмства малодшых школьнікаў з беларускім песенным фальклорам. Таму сваё задачай мы бачым распрацоўку заданняў па больш глыбокім вывучэнні беларускіх народных песень на ўроках літаратурнага чытання, для таго, каб сфарміраваць у дзяцей выразнае разуменне спецыфікі беларускага фальклору.

Артыкул падрыхтаваны пры фінансавай падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (№ДР1209).

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. Алексеев, Э. Е. Фольклор в контексте современной культуры / Э. Е. Алексеев. – М. : Образование, 2007. – 45 с.

2. Антонава, Н. У. Літаратурнае чытанне : вучэб. дапам. для 2-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / Н. У. Антонава, І. А Буторына, Г. А. Галяш– Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2021. – Ч4. Жуковіч, М. В. Літаратурнае чытанне : вучэб. дапам. для 3-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / М. В. 2. - 135 с.

3. Жуковіч, М. В. Літаратурнае чытанне : вучэб. дапам. для 3-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / М. В. Жуковіч. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2021. – Ч. 2. – 117 с.

3. Жуковіч, М. В. Літаратурнае чытанне : вучэб. дапам. для 4-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / М. В. Жуковіч. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2021. – Ч. 2. – 125 с.

5. Примерное календарно-тематическое планирование : пособие для учителей учреждений общего среднего образования с белорусским и русским языками обучения/ А. Р. Гуляева [и др.]. – Мінск : Адукаця і выхаванне, 2008. – 144 с.

6. Канцэпцыя вучэбнага прадмета "Літаратурнае чытанне" : I ступень агульнай сярэдняй адукацыі (для агульнаадукацыйных устаноў з беларускай мовай навучання) – Мінск : Национальный институт образования, 2009. – 10 с.